ДУК “Пінская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі цэнтральнай бібліятэкі

Чытальная зала

# ШАПАШНІК БАРЫС ЛЬВОВІЧ



## (ДА 120-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ)

## ШОРТ-ЛІСТ

Пінск, 2022

Барыс Львовіч Шапашнік нарадзіўся 17 снежня 1902 г. у г. Пінску Мінскай губерні (цяпер Брэсцкай вобласці) у беднай шматдзетнай яўрэйскай сям'і. Бацькі імкнуліся даць дзецям адукацыю. Барыс наведваў пачатковую 4-класную школу, а затым вышэйшае 4-класнае вучылішча, якое не закончыў з-за недахопу сродкаў, але займаўся самаадукацыяй.

З мэтай працягваць адукацыю Барыс Шапашнік паехаў у Маскву, у 1920 г. паступіў на рабфак пры механіка-электратэхнічным інстытуце імя М. В. Ламаносава. Пасля яго заканчэння стаў студэнтам Маскоўскага вышэйшага тэхнічнага вучылішча.

З 1929 г. Барыс Шапашнік працаваў слесарам на Маскоўскім аўтазаводзе «АМО» (з 1931 г. – завод імя І. В. Сталіна – ЗіС). У снежні 1930 г., пасля абароны дыплома, атрымаў пасаду тэхніка, затым – інжынера-канструктара канструктарскага аддзела. Займаў пасады: намеснік кіраўніка групы рухавікоў і трансмісіі, вядучы канструктар па рухавіках і каробках перадач, начальнік аддзела карбюратарных рухавікоў, начальнік канструктарскага аддзела, часова выконваючы абавязкі галоўнага канструктара, галоўны канструктар.

У час Вялікай Айчыннай вайны многія заводы Масквы былі эвакуіраваны на ўсход. Б. Л. Шапашнік стаў галоўным канструктарам Ульянаўскага аўтазавода (УльЗіС, будучы УАЗ). З вясны 1942 г. пачынаецца выпуск грузавых аўтамабіляў ЗіС-5В. Да 1 мая 1944 г. пад кіраўніцтвам Б. Л. Шапашніка пабудаваны вопытны ўзор грузавога аўтамабіля ЗіС-253, які задумваўся як уніфікаваны з перспектыўнай Маскоўскай грузавой мадэллю ЗіС-150.

У 1946 г. Б. Л. Шапашнік быў прызначаны галоўным канструктарам канструктарскага аддзела будуемага аўтамабільнага завода ў Новасібірску. Але ў 1948 г. пастановай Савета Міністраў СССР вытворчасць была расфарміравана, канструктарскія распрацоўкі перадалі на Мінскі аўтазавод.

У 1949 г. Б. Л. Шапашнік вярнуўся ў Беларусь, назначаны галоўным канструктарам Мінскага аўтамабільнага завода (МАЗ). Вырашаў задачу распрацоўкі канструктарскай дакументацыі, вырабу і правядзення выпрабавання вопытных узораў, пастаўкі на серыйную вытворчасць аўтамабіля МАЗ-525 грузападымальнасцю 25 т.

У 1954 г. Б. Л. Шапашнік – галоўны канструктар арганізаванага спецыяльнага канструктарскага бюро № 1 (СКБ-1) МАЗа з пастаўленай мэтай стварэння і выпуску шматвосевых колавых паўнапрывадных цягачоў вялікай грузападымальнасці прызначаных для розных сістэм цяжкага ўзбраення. У 1955–1956 гг. выраблены першыя вопытныя машыны СКБ, у тым ліку заднематорны інжынерны цягач МАЗ-528 (4х4); аднавосевы цягач МАЗ-529 (2х2); цягач-лесавоз МАЗ-532 (4х4) з планетарнымі колавымі рэдуктарамі і вынесеным наперад рухавіком і артылерыйскі цягач МАЗ-535 (8х8).

У пачатку 1960-х гг. Б. Л. Шапашнік прыступіў да выканання чарговага задання – стварэння спецыяльнага шасі высокай праходнасці, прызначанага для мантажу ракетных пускавых установак. Выкарыстоўваючы напрацаваны вопыт па паўнапрывадных цягачам, калектыў СКБ-1 у сціснутыя тэрміны

распрацаваў канструктарскую дакументацыю, значна павялічыўшы колькасць новых тэхнічных рашэнняў, якія забяспечваюць выкананне ТТТ МО. Вынік – унікальнае шасі МАЗ-543 (8х8), якое валодае шматлікімі перавагамі ў параўнанні з замежнымі шасі-аналагамі. Далей рушылі ўслед мадыфікацыі гэтага аўтамабіля, якія пашыралі яго магчымасці, якія адрозніваліся кампаноўкай і мантажнай плошчай (для ракетных комплексаў СПА, сістэм залпавага агню, артылерыйскіх сістэм, агрэгатаў для транспарціроўкі элементаў комплексаў), у тым ліку і прызначаныя для народнай гаспадаркі.

У 1970 г. на аснове МАЗ-543 было распрацавана сямейства «Оплот». Усе аўтамабілі гэтай серыі мелі рухавікі магутнасцю 650 к. с., новыя ўзмоцненыя ГМП, узмоцненую падвеску пярэдняй і задняй восяў, мадэрнізаваныя шыны. Пасля мадэрнізацыі шасі МАЗ-543 яго мадэфікацыі сталі ўжывацца для шэрагу ракетных і артылерыйскіх комплексаў: С-300, «Эльбрус», «Пионер», «Рубеж», «Берег», «Смерч» і інш.

Чарговы этап творчай працы Б. Л. Шапашніка – стварэнне ўніфікаваных паўнапрывадных шасі падвышанай грузападымальнасці колавай формулы 12х12 (МАЗ-547) і 14х12 (МАЗ-7912), якія сталі, у сваю чаргу, базай для стварэння самаходных пускавых установак для міжкантынентальных ракетных комплексаў стратэгічнага прызначэння.

Выбітны канструктар узнагароджаны двума ордэнамі Леніна (1968, 1973), ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга (1944, 1961), ордэнам «Знак Пашаны» (1959), медалямі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1968). Лаўрэат Ленінскай прэміі (1976). Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларускай ССР (1962). Доктар тэхнічных навук (1983).

За заслугі ў стварэнні аўтамабіляў высокай праходнасці і грузападымальнасці Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 7 сакавіка 1973 г. Б. Л. Шапашніку было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Серп и Молот».

Б. Л. Шапашнік у выніку цяжкой хваробы памёр 12 верасня 1985 г., пахаваны на Чыжоўскіх могілках г. Мінска. На доме, дзе ён жыў (вул. Кальварыйская, 4), устаноўлена мемарыяльная дошка. У гонар канструктара-земляка ў Пінску ў 1989 г. названа вуліца. 15 снежня 2016 г. на тэрыторыі Мінскага завода колавых цягачоў устаноўлены бюст. У верасні 2022 г. у Музеі Беларускага Палесся адкрыта экспазіцыя, прымеркаваная да 120-годдзя з дня нараджэння Б. Л. Шапашніка.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2022 г. Пінскай цэнтральнай гарадской бібліятэкай. Літвінчык В. К., бібліёграф аддзела абслугоўвання і інфармацыі

1. **Шапашнік Барыс Львовіч** / М. М. Касцюковіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 2003. Т. 17. С. 372.

2. **Шапошник Борис Львович** // Твои герои, Беларусь! Герои Социалистического Труда : биографический справочник. Минск, 2014. С. 238–239.
3. **Глазов, В. И.** Борис Шапошник. Четкая и длинная линия – в жизни и чертежах / автор-составитель В. И. Глазов // Симфония еврейских судеб Брестчины / автор-составитель В. И. Глазов. Брест, 2015. С. 140–143.
4. **Шапіра, С.** Геній аўтамабілебудавання / С. Шапіра // Памяць. Пінск : гіст.-дакум. хроніка. Мінск : БЕЛТА, 1998. С. 478–479.
5. **Качук, Н.** Гениальный невидимка : [о конструкторе автомобилей Б. Л. Шапошнике] / Николай Качук // СБ. Беларусь сегодня. 2020. 29 января. С. 8–9 ; 30 января. С. 12–13.
6. **До поры он оставался «невидимкой»** : [о конструкторе автомобилей Б. Л. Шапошнике] // Пінскі веснік. 2018. 9 сакавіка. С. 3.
7. **Глазов, В.** Конструктор Борис Шапошник : четкая и длинная линия – в жизни и чертежах / Владимир Глазов // Брестский курьер. 2013. 26 сентября (№ 39). С. 20.
8. **Карповский, Я.** Создатель шасси для ракет : [к 110-летию со дня рождения Б. Л. Шапошника] / Яков Карповский // 7 дней. 2013. 10 января (№ 2). С. 11.
9. **Злобин, Л.** Гениальный невидимка : Борис Львович Шапошник / Лев Злобин, Леонид Бабейчук // Пінскі веснік. 2012. 14 снежня. С. 3.
10. **Карповский, Я.** «Выручил всех Б. Л. Шапошник...» / Яков Карповский // Грузовик. Москва, 2009. № 11. С. 46–47 ; № 12. С. 38–44.
11. **Попель, Н.** Автомобиль белорусского конструктора : [о военных автомобилях МАЗ-543, разработанных под руководством Б. Л. Шапошника] / Наталья Попель // Белорусская военная газета. 2008. 17 июля.
12. **Качук, Н.** Крепя ракетно-ядерный щит Отечества : [о машинах, созданных конструктором Б. Л. Шапошником] / Николай Качук // Армия. 2007. № 1 ; № 2 ; № 4. С. 55–59 ; № 5 ; № 6. С. 48–53.
13. **Шапиро, С.** Засекреченный ученый / Семен Шапиро // Заря. 2007. 27 января. С. 5.
14. **Шапиро, С.** «Сороконожка» для «Пионера» : [имя в истории – конструктор Б. Л. Шапошник] / Семен Шапиро // Полесская правда. Пинск, 2003. 25 января. С. 3 ; 4 апреля. С. 5.
15. **Бориса Шапошника знают и чтут в Натании** : [к 100-летию со дня рождения Б. Л. Шапошника] // Карлин. Пинск, 2003. 9 февраля. С. 3.
16. **Бибиков, В**. Атлант и «Волаты» / Владимир Бибиков // Советская Белоруссия. 2003. 18 января.
17. **Чвялев, В. Е.** Борис Львович Шапошник : (к 100-летию со дня рождения) / В. Е. Чвялев // Автомобильная промышленность. 2002. № 12.
18. **Шугуров, Л**. Закрытый конструктор Борис Шапошник / Лев Шугуров // За рулем. 1997. № 5.

19. **Шапиро, С.** Когда спали оковы запретов : [под руководством Б. Л. Шапошника были созданы образцы автомобильной техники] / Семен Шапиро // Полесская правда. Пинск, 1994. 24 сентября.

Пінск
Шапашнік Барыс Львовіч
Канструктары
Героі Сацыялістычнай Працы
Лаўрэаты Дзяржаўнай прэміі
Лаўрэаты Ленінскай прэміі